# 22 ліпеня — 100 гадоў з дня нараджэння М. Г. Булахава, мовазнаўца, педагога

***К. Д. Варанько,***
*вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

**Адзін з найбольш аўтарытэтных беларускіх славістаў Міхаіл Гапеевіч Булахаў (1919—2012) вывучаў беларускае, рускае і славянскае мовазнаўства, удасканальваў методыку выкладання лінгвістычных дысцыплін у навучальных установах. Ён аўтар шматлікіх навуковых, метадычных і энцыклапедычных прац: манаграфій, слоўнікаў, вучэбных дапаможнікаў, нарысаў, артыкулаў, рэцэнзій, водгукаў, тэзісаў дакладаў і інш.**

Нарадзіўся М. Г. Булахаў у в. Маслакі Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. У 1940 годзе скончыў факультэт мовы і літаратуры Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. Удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне. Пасля службы ў Цэнтральнай групе войскаў у Чэхаславакіі і Венгрыі. Быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.».

У сакавіку 1946 года М. Г. Булахаў быў залічаны ў аспірантуру Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. З 1948-га працаваў тут асістэнтам, старшым выкладчыкам, затым загадчыкам кафедры рускай мовы. Праз два гады паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Исследование лексики Д. И. Писарева (“Реалисты”)». З 1951 года — старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мовы, літаратуры і мастацтва Акадэміі навук БССР, у 1952—1956 гадах — загадчык сектара сучаснай беларускай мовы і культуры мовы гэтай установы. Таксама працягваў выкладаць у педінстытуце. У 1965 годзе абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «История адъективного формообразования и формоупотребления в белорусском языке». Атрымаў вучоную ступень доктара філалагічных навук, пазней — вучонае званне прафесара. З 1965 года М. Г. Булахаў з’яўляўся загадчыкам кафедры агульнага мовазнаўства і рускай мовы філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна. З 1969-га па 1975 год рэдагаваў навуковы часопіс «Веснік БДУ. Серыя 4. Філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія». З 1975 года зноў выкладаў у МДПІ імя А. М. Горкага. У 1990—2005 гадах быў прафесарам кафедры тэорыі і гісторыі мовы факультэта рускай філалогіі (установа адукацыі ўжо мела назву «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»).



Шматграннай была грамадская дзейнасць М. Г. Булахава. Ён з'яўляўся членам Міжнароднай камісіі па гісторыі славістыкі пры Міжнародным камітэце славістаў, Навукова-метадычнага савета па рускай мове пры Міністэрстве адукацыі СССР і інш. З шэрагам дакладаў і паведамленняў выступаў на міжнародных славістычных кангрэсах, сімпозіумах. Чытаў лекцыі па славянскім мовазнаўстве ва ўніверсітэтах Беларусі, Расіі, Украіны, Славеніі, Балгарыі і Германіі і іншых краін. Пад кіраўніцтвам М. Г. Булахава падрыхтаваны і абаронены 33 кандыдацкія дысертацыі, ён быў таксама навуковым кансультантам 10 дактарантаў. У 1971 годзе стаў заслужаным дзеячам навукі БССР.

З 1950-х гадоў М. Г. Булахаў шмат працаваў над падрыхтоўкай навучальных дапаможнікаў па беларускай і рускай мовах для сярэдніх і вышэйшых педагагічных навучальных устаноў. Быў кіраўніком многіх калектыўных навуковых прац. Выдаў дапаможнік «Практыкаванні і матэрыялы па гісторыі беларускай мовы» (1956; перавыдадзены ў 1969 годзе пад назвай «Практыкаванні і матэрыялы па курсу гісторыі беларускай мовы»). Стаў суаўтарам кнігі «Нарысы па гісторыі беларускай мовы» (1957), падручнікаў і навучальных дапаможнікаў для студэнтаў «Беларуская мова» (ч. 1—2, 1955, 1958), «Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы» (1957, 1959, 1961), «Граматыка беларускай мовы» (т. 1—2, 1962—1966), «Восточнославянские языки» (1987) і інш.

Большасць прац вучонага (каля 200) ахопліваюць праблемы сучаснай беларускай мовы, яе гісторыі і ўзаемадзеяння з іншымі славянскімі мовамі на розных этапах развіцця. Ён даследаваў мову старажытных беларускіх помнікаў, першадрукаў Францыска Скарыны, твораў XVII—XX стагоддзяў. З'яўляецца аўтарам навуковых прац «Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў XIX—XX стст. ва ўзаемаадносінах з іншымі славянскімі мовамі» (1958), «Прыметнік у беларускай мове» (1964), «Гісторыя прыметнікаў беларускай мовы XIV—XVII стагоддзяў» (ч. 2. Сінтаксічны нарыс, 1971; ч. 3. Лексікалагічны нарыс (агульнаславянская лексіка), 1973). Ён аўтар першага ў айчынным мовазнаўстве біябібліяграфічнага слоўніка «Восточнославянские языковеды» (т. 1—3, 1976—1978). У ім змешчаны найбольш важныя звесткі пра жыццё і навуковую дзейнасць рускіх, беларускіх і ўкраінскіх навукоўцаў, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё лінгвістычных ведаў ва ўсходнеславянскіх краінах з XVI па XX стагоддзе. У 26 (з 354) нарысах расказваецца пра беларускіх лінгвістаў І. І. Насовіча, Я. Ф. Карскага, Б. А. Тарашкевіча, С. М. Некрашэвіча, М. Я. Байкова, П. А. Бузука і іншых. Заснавальніку беларускага мовазнаўства Я. Ф. Карскаму ён прысвяціў манаграфію «Евфимий Фёдорович Карский: жизнь, научная и общественная деятельность» (1981), у якой прааналізаваў галоўныя лінгвістычныя працы акадэміка.

У 2001 годзе была выдадзена кніга М. Г. Булахава «Славянские языки: происхождение, история, современное состояние», у якой прадстаўлены кароткія звесткі пра гісторыю вывучэння славянскіх моў вучонымі Расіі, Украіны, Беларусі, даецца падрабязная характарыстыка кожнай славянскай мовы з апісаннем паходжання, гісторыі развіцця і сучаснага стану. Навуковы пяцітомны слоўнік аўтара «Опыт исторического словаря русской лингвистической терминологии» (т. 1—5, 2002—2005) — эталон славянскай тэрмінаграфіі. Складаецца з артыкулаў (каля 6570), размешчаных у алфавітным парадку тэрмінаў. Аўтар даследаваў асобныя тэрміны, выкарыстаныя ў старадрукаваных

усходнеславянскіх граматыках і слоўніках XVI—XVII стагоддзяў, а таксама тэрміны, зафіксаваныя ў розных лінгвістычных часопісах, зборніках артыкулаў, рэфератыўных аглядах, публікацыях дакладаў і матэрыялаў міжнародных славістычных кангрэсаў, сімпозіумаў, якія праходзілі ў другой палове XX стагоддзя.

Асаблівае месца сярод даследаванняў М. Г. Булахава займаюць працы, прысвечаныя знакамітаму паэтычнаму помніку ўсходніх славян — «Слову о полку Игореве». Фундаментальная кніга «“Слово о полку Игореве” в литературе, искусстве, науке» (1989) стала плёнам напружанага пошуку новых фактаў і дакументаў, глыбокага асэнсавання, аналізу і сістэматызацыі назапашанага матэрыялу, першым вопытам энцыклапедычнага абагульнення вынікаў даследаванняў твора і асваення помніка ў літаратуры і мастацтве розных краін. Усяго ў слоўніку больш за 400 артыкулаў, якія дазваляюць прадставіць гісторыю вывучэння помніка ў Беларусі і за мяжой. Вучоны прымаў актыўны ўдзел у стварэнні пяцітомнай «Энциклопедии “Слова о полку Игореве”» (т. 1—5, 1995). У 2000 годзе выйшла з друку манаграфія М. Г. Булахава «“Слово о полку Игореве” і Беларусь» (у 2 ч.), у якой праведзены параўнальны лінгвістычны аналіз перакладаў твора на беларускую мову. У 2012 годзе была апублікавана кніга «Беларускія перакладчыкі, даследчыкі, ілюстратары “Слова о полку Игореве”»; у 2013-м — «“Слово о полку Игореве” в переводах на славянские языки XIX—XX вв.». Навуковыя даследаванні М. Г. Булахава публікаваліся ў Беларусі, Расіі, Украіне, Сербіі, Балгарыі, Польшчы, ЗША, Германіі і іншых краінах. Большасць з іх атрымала высокую ацэнку ў шматлікіх водгуках і рэцэнзіях айчынных і замежных філолагаў.

За плённую навуковую і педагагічную дзейнасць вучоны ўзнагароджаны знакам «Выдатнік народнай асветы БССР», медалямі, у тым ліку медалём Францыска Скарыны (1990), ордэнам Францыска Скарыны (1997), Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР і Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і інш. У гонар 95-годдзя з дня нараджэння М. Г. Булахава ў 2014 годзе ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка была праведзена навуковая канферэнцыя «Слова ў часе і прасторы».

*Працы М. Г. Булахава*

Избранные работы по языкознанию: русистика, белорусистика, славистика / М. Г. Булахов. — Минск : Право и экономика, 2009. — 583 с.

Опыт исторического словаря русской лингвистической терминологии : в 5 т. / М. Г. Булахов ; М-во образования Респ. Беларусь, УО «Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка». — Минск : БГПУ им. М. Танка, 2002—2005.

Славянские языки: происхождение, история, современное состояние / М. Г. Булахов ; М-во образования Респ. Беларусь, Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка. — Минск : БГПУ им. М. Танка, 2001. — 225 с.

«Слово о плъку Игоревѣ» в переводах на славянские языки XIX—XX вв. / М. Г. Булахов ; авт. предисл. Е. И. Янович. — 2-е изд. — Минск : Беларуская навука, 2015. — 359 с.

Беларускія перакладчыкі, даследчыкі, ілюстратары «Слова о плъку Игоревѣ» / М. Г. Булахаў ; уступ. арт. Н. Паляшчук. — Мінск : Беларуская навука, 2012. — 166 с.

«Слово о плъку Игоревѣ» і Беларусь : да 200-годдзя першага выдання «Слова о плъку Игоревѣ» : манаграфія : у 2 ч. / М. Г. Булахаў ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка. — Мінск : БДПУ імя М. Танка, 2000.